

ДАЛУЧЫЦЦА ДА ТРАДЫЦЫЙ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Сямейная газета

ЯК АДАРВАЦЬ ДЗЯЦЕЙ АД ГАДЖЭТАЎ



Сямейная газета


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ВЕРАСНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 188 (30068)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ПЯРЦОЎ, міністр інфармацыі:**

*«Беларускі бок падзяляе падыходы ШАС да супрацьдзеяння аднапалярнаму свету, пратэкцыянізму і гандлёвым войнам, зацікаўлены ў нарошчванні новых міжнародных транспартных калідораў, гатовы супрацоўнічаць у галіне гуманітарных праектаў. У медыягаліне ў Беларусі з многімі ўдзельнікамі краін ШАС ужо выбудаваны доўгатэрміновы і перспектыўны вектар развіцця. Сёння вядучыя дзяржаўныя СМІ Беларусі ў рамках існуючых дамоўленасцяў актыўна ўзаемадзейнічаюць з найбуйнейшымі медыярэсурсамі Расійскай Федэрацыі, КНР, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, Узбекістана, Пакістана, Індыі і Ірана. Упэўнены, што будучыня нашай сумеснай дзейнасці — у надзейным і ўзаемавыгадным інтэграцыйным партнёрстве».*

# Скарынава шахта





Салігарчанін Аляксандр СКАРЫНА 35 гадоў адпрацаваў пад зямлёй. Аляксандр з нуля сабраў шахцёрскую брыгаду і паставіў рэкорд па здабычы руды. Упартасць і працавітасць дазволіла шахцёрам літаральна горы звярнуць. За 35 гадоў Аляксандр Яўгенавіч настолькі прывык да падземных тунэляў, што, калі прыйшоў час выйсці на пенсію, доўга не мог гэтага зрабіць. Ён — заслужаны ветэран працы ААТ «Беларуськалій», поўны кавалер знака «Шахцёрская слава», узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». З гонарам носіць званне «Заслужаны шахцёр Рэспублікі Беларусь».

У сваёй акрузе

## «ЛЮДЗІ ЧАКАЮЦЬ»

### Адзін дзень дэпутата ў рэгіёне

**На працягу тыдня штомесяц дэпутат Палаты прадстаўнікоў Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ прысвячае рабоце ў сваёй выбарчай акрузе. Асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, выязныя сустрэчы з выбаршчыкамі, наведванне сацыяльна значных аб'ектаў — графік парламентарыя заўсёды насычаны... Карэспандэнт «Звязды» правяла адзін дзень з дэпутатам у Хойніцкім раёне і пераканалася: справа гэта няпростая, але ўдзячная.**



Дэпутат Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ падчас наведвання прадпрыемства «Спецславія» ў Хойніцкім раёне.

СТАР. 4

Разумныя грошы

## Скарбонка дабрабыту

### Якія працэнты па дэпазітах і даходнасць каштоўных папер?

**Многія з нас імкнуцца эканоміць, каб захаваць грошы для падушкі бяспекі і буйных пакупак. Праўда, не заўсёды атрымліваецца зберагчы свае назапашванні проста так — заўсёды з'яўляецца неабходнасць у тэрміновых тратах, пасля якіх уся зарплата проста «раствараецца» ў дробных пакупках. Існуе жалезнае правіла назапашвання грошай. Трэба з кожнага даходу адкладаць 10—15 %. Атрымалі зарплату — адкладайце дзясятую частку на назапашвальны рахунак, прыйшоў ганарар за падпрацоўку — пакладзіце 10 % на дэпазіт. Калі ж хочаце хутка назапасіць на буйную куплю, то назапашваць трэба больш — ад 30 да 40 % ад усякага даходу. Колькі трэба адкладаць, мы разабраліся, цяпер удакладнім — куды?**

### ЛЕПШ ЗА ЎСЁ БЕЗАДЗЫЎНЫ

Варыянтаў мноства, але яны залежаць ад сумы вашых накапленняў. Самы першы, які прыходзіць у галаву большасці і даступны ўсім, — адкрыць дэпазіт. Але не ўсё так проста, бо тэндэнцыі змяняюцца. Давайце разбяромся, якія бываюць банкаўскія ўклады і колькі можна на гэтым зарабіць.

Уклады дзеляцца на дзве асноўныя катэгорыі — адзыўныя і безадзыўныя. Адзыўны дэпазіт афармляецца на пэўны тэрмін, але пры жаданні вы можаце ў любы момант забраць свае грошы — цалкам або часткова. Ужо за саму магчымасць у любы час пакарыстацца сваімі грашыма кліент банка расплачваецца паніжанымі працэнтамі. Самы выгадны адзыўны дэпазіт тэрмінам ад месяца да года прадугледжвае 1—7 % гадавых. Гэта значна менш, чым па стаўцы безадзыўнага ўкладу.

СТАР. 4

## КОРАТКА

- **У Беларусі намалочана 7,7 млн тон збожжа з улікам рапсу.**
- Прафілактычная акцыя «Цвярозы вадзіцель» пройдзе ў Мінскай вобласці з 28 верасня да 1 кастрычніка.
- **Пажылыя людзі змогуць бясплатна наведаць Нацыянальны мастацкі музей 30 верасня.**
- Ліміт бяспошліннага ўвозу тавараў фізічнымі асобамі ў ЕАЭС у памеры 1 тыс. еўра і 31 кг працягнуты да 1 красавіка 2024 года.

ISSN 1990 — 763X